## *Партыйнае жыццё*

# ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ—НА НАЛЕЖНЫ ЎЗРОВЕНЬ

## (З партыйных сходаў універсітэта)

**15 снежня адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. З дакладам «Аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС «Аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах» выступіў сакратар парткома Р. В. Булацкі. Сход па-дзеламову абмеркаваў гэтае важнае пытанне і прыняў разгорнутае рашэнне, накіраванае на паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы ва ўніверсітэце.**

**Падрабязную справаздачу аб гэтым сходзе чытайце ў адным з наступных нумароў.**

Выхаванне чалавека... Што можа быць важней за гэта ў наш час? Якая задача можа быць больш адказнай, чым задача выхавання будаўнікоў камуністычнага грамадства? А якія яны, будучыя будаўнікі камунізма? Як жывуць, чым займаюцца?

Гэтыя пытанні сталі тэмай размоў на партыйных сходах філалагічнага, фізічнага і геаграфічнага факультэтаў. Тэма сур'ёзная, і размова павінна быць вялікай і сур'ёзнай. Паглядзім, ці адбылася такая размова?

☆ ☆

Чалавек паступіў на філалагічны факультэт, ён любіць родную мову, літаратуру. Ён рыхтуецца стаць педагогам. Прафесія самая высокая і пачэсная. Як жа рыхтуе сябе чалавек да яе? Як дапамагаюць яму ў гэтым камуністы факультэта?

Адказ на гэта далі дакладчык камуніст тав. Лысенка і выступіўшыя ў спрэчках.

Камуніст—наш старэйшы таварыш. Ён павінен быць нашым дарадчыкам і настаўнікам. І, зразумела, што сваё выступленне на сходзе сакратар камсамольскай арганізацыі Э. Кандзерскі прысвяціў сувязям, якія ёсць паміж камсамольскай арганізацыяй і партыйнай групай аддзялення. Гэтыя сувязі дапамагаюць у працы. За апошні час значна палепшылася грамадская работа, на аддзяленні пачалі праводзіцца сустрэчы, вечары.

Нядаўна студэнты аддзялення журналістыкі прымалі ў сябе сваіх старэйшых таварышаў па прафесіі—віднейшых работнікаў друку Беларусі. «Прафесія журналіста—ганаровая прафесія»—на такую тэму адбылася сустрэча. Была яна вельмі цікавай і карыснай. Усе засталіся задаволены ёю —і студэнты, і журналісты.

Некалькі дзён назад у інтэрнаце філолагаў быў праведзен вечар адпачынку. Хто жадаў—паказаў свае таленты ў танцах, у выкананні песень. На вечары прысутнічалі будучыя журналісты, студэнты рускага і беларускага аддзяленняў.

Хіба ж не гавораць гэтыя прыклады аб тым, што адпачынак студэнтаў можна зрабіць цікавым і карысным? Было б толькі жаданне ва ўсіх, быў бы малады запал, жывінка у гэтай справе.

Аб маральным вобліку студэнта цяжка меркаваць па яго паводзінах на лекцыях. На лекцыях ён можа быць ветлівым, акуратна апранутым, уважлівым. А вось як вядзе ён сябе ў інтэрнаце, які стаў другім домам для студэнтаў?

Гэтаму пытанню прысвяцілі сваё выступленне камуністы Кошман і Стрыжэвіч.

— Сістэматычна ў інтэрнаце праводзяцца праверкі санітарнага становішча пакояў,—гаворыць Кошман.—І вось нядаўна, калі санкамісія зайшла ў пакой № 119, яна была абурана. Калі б і хацеў, то, мусіць, не зрабіў бы горшы хаос, які быў тут: пад ложкамі валяліся бутэлькі, на ложках—шкарпэткі, акуркі, на падлозе—смецце. А жывуць жа тут дзяўчаты: Кішкурна, Котава, Муха, Пашкевіч.

Дрэнна праводзіць сябе і жыхарка пакоя № 102 Іваніцкая.

І гэта людзі, якія хочуць быць журналістамі, педагогамі, выкладчыкамі.

Студсавет вынес правільнае рашэнне: выселіць парушальнікаў грамадскага парадку з інтэрната.

— Безумоўна, у тым, што ў нашым інтэрнаце ёсць яшчэ непарадкі, вінаваты мы самі,—заявіў старшыня прафсаюзнага бюро факультэта Анатоль Стрыжэвіч.—Да таго ж, у нас дрэнна наладжана дзяжурства ў вестыбюлі.

Камуніст тав. Паіна заявіла, што пытанне аб выхаванні было і застаецца самым надзённым у рабоце камуністаў. Меркаваць аб выхаванні студэнтаў трэба не па ліку палітінфармацый, гутарак, праведзеных у той ці іншай групе, а па выніках. А вынікі ў нас не заўсёды станоўчыя. І гэта гаворыць аб тым, што мы недастаткова ўдзяляем увагі гэтаму пытанню.

— Гэта сапраўды так, — падтрымала яе камуніст Жыдовіч.— Часта мы заўважаем дрэнные толькі тады, калі яно дае свае вынікі. Вось нядаўна перадавалі па радыё фельетон аб былым нашым студэнце Мележу. Хутка яго будуць судзіць за падробку дакументаў і кінабілетаў. Падумаць толькі—да чаго дайшоў чалавек: падрабляць свой пашпарт і атрымліваць па ім чужыя грошы! А ён жа рыхтаваўся стаць выхавацелем, настаўнікам, выхоўваць нашых дзяцей. Страшна тое, што таварышы яго ведалі аб гэтых махлярствах. Яны не спынілі Мележа і ў выніку ён апынуўся на лаве падсудных.

Сакратар парткома універсітэта тав. Булацкі падкрэсліў, што зараз перад партыйнай арганізацыяй факультэта стаіць вельмі складаная і адказная задача. Неабходна ў бліжэйшы час рэзка палепшыць выхаваўчую работу, павысіць дысцыпліну на факультэце, назаўсёды паканчыць з усялякімі праяўленнямі амаральных паводзін студэнтаў, аспірантаў.

Сход прыняў адпаведную рэзалюцыю.

☆ ☆

З такім жа парадкам дня адбыўся сход і на фізічным факультэце. Даклад аб становішчы выхаваўчай работы на факультэце і аб мерах яе паляпшэння зрабіў камуніст Круцько.

Аналізуючы становішча выхаваўчай работы на нашым факультэце, мы можам убачыць, што ў нас справы абстаяць не вельмі добра. Звернемся да прыкладаў. Былыя студэнты Шэйтэльман, Зільберт і Баршай, нядаўна пераведзеныя з вячэрняга аддзялення, зрабілі цяжкі амаральны ўчынак, які паклаў чорную пляму на ўвесь наш калектыў. Дрэнна працавалі некаторыя студэнты ў калгасах.

Асабліва гэта датычыцца некаторых студэнтаў другога курса.

Так, камсорг адной з груп Чарвонцаў не толькі сам не быў прыкладам для таварышаў, але ішоў на паваду ў такіх парушальнікаў дысцыпліны, як Фікангур і Купрэў.

Усё гэта гаворыць аб тым, што палітыка-выхаваўчая работа на факультэце аказалася ў запушчаным стане. Гэта мы павінны прызнаць і зрабіць адпаведныя вывады.

Мы слаба, а іншы раз і зусім дрэнна, выкарыстоўваем тыя сродкі выхаваўчай работы, якія ў нас ёсць. Узяць, напрыклад, работу выкладчыкаў, замацаваных за студэнцкімі групамі. Гэта вельмі важны ўчастак выхаваўчай работы. А становішча тут дрэннае. Некаторыя выкладчыкі недастаткова глыбока ўнікаюць у жыццё студэнтаў, слаба аказваюць дапамогу камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям.

Слабы ўдзел у выхаваўчай рабоце прымаюць і кафедры. А яны павінны цікавіцца не толькі вучобай студэнтаў, але і іх жыццём, бытам. Пытанні выхаваўчай работы зусім выпалі з поля зроку факультэцкага вучонага савета.

Мы не дабіліся баявітасці ў рабоце камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый. Слаба развіта крытыка і самакрытыка. Таму аб усіх праступках мы даведваемся толькі тады, калі яны адбываюцца.

Дакладчык гаварыў аб тых мерах, якія трэба неадкладна прыняць, каб палепшыць выхаваўчую работу на фукультэце.

У спрэчках выступілі многія камуністы і беспартыйныя. Трэба адзначыць, што спрэчкі былі гарачыя і ажыўленыя, размова атрымалася сур'ёзная.

— Вось у нас мала хто з выкладчыкаў прысутнічае на камсамольскіх сходах,—зазначыў камсорг факультэта Салаў.—А варта было б. На сходах жа часта вырашаюцца такія пытанні, якія маюць непасрэдную сувязь з вытворчай работай.

— Цяжкія праступкі пачынаюцца з дробязей, —сказаў камуніст Нікалаеня.—Гэта пачынаецца з нягаспадарчых адносін студэнтаў да маёмасці, з ненаведвання лекцый, з дрэнных паводзін у быту. Трэба ліквідаваць усё гэта ў самым пачатку.

Сакратар камітэта камсамола універсітэта тав. Малюковіч зазначыў, што зараз на першым курсе фізфака дрэнная дысцыпліна. У чым справа? Напэўна, вось у чым. Першы курс у асноўным складаецца з мінчан, а сярод іх і маецца большая частка парушальнікаў дысцыпліны. Узяць хоць бы апошнія падзеі на курсе. За сістэматычныя прапускі заняткаў дэканам факультэта прадстаўлен да выключэння з універсітэта студэнт Верашчагін. Студэнты Полазаў, Трафімаў, Мартынец, Раждзественскі, Скірмунт, Гладкіх і іншыя (усяго 11 чалавек) атрымалі спагнанні і вымовы.

Відаць, на фізічным факультэце яшчэ недастаткова працуюць над паляпшэннем выхаваўчай работы сярод студэнтаў, якія нядаўна паступілі ва універсітэт.

Сход прыняў рашэнне, у якім прадугледжаны многія мерапрыемствы па паляпшэнню палітыка-выхаваўчай работы на факультэце.

☆ ☆

13 снежня на геаграфічным факультэце адбыўся адкрыты партыйны сход, прысвечаны стану выхаваўчай работы сярод студэнтаў. На сходзе прысутнічалі прадстаўнікі студэнцкіх груп. Дакладчык А. С. Акінчыц адзначыў, што формы палітыка-выхаваўчай работы на факультэце самыя разнастайныя. Акрамя вывучэння грамадска-палітычных дысцыплін на лекцыях, студэнты штотыднёва слухаюць палітінфармацыі, якія праводзяць іх жа сябры. Далей тав. Акінчыц адзначыў, што вялікую цікавасць сярод грамадскасці універсітэта выклікалі выступленні дацэнта І. І. Трухана, які расказаў аб выніках XIX Міжнароднага геаграфічнага кангрэсу у Стакгольме, і майстроў спорту Караваева і Гараева, якія правялі гутарку на тэму: «Алімпійскія гульні 1960 года».

— Пажадана,—гаварыў дакладчык,—у далейшым праводзіць больш такіх сустрэч.

Дакладчык больш падрабязна спыняецца на пытаннях адпачынку і быту студэнтаў, а таксама іх вучобы. На факультэце рэгулярна працуюць тры гурткі мастацкай самадзейнасці: харавы, драматычны і танцавальны, у якіх удзельнічаюць больш 60 чалавек. Да кіраўніцтва імі прыцягнуты студэнты кансерваторыі і тэатральна-мастацкага інстытута. Рэгулярна арганізуюцца культпаходы ў кіно і тэатры, але, нажаль, не праводзіцца абмеркаванне прагледжаных карцін і спектакляў, дыспутаў па прачытаных кнігах. Не так даўно цікавыя вечары адбыліся на першым і другіх курсах, дзе студэнты доўга і горача гаварылі аб хвалюючых іх пытаннях.

Асноўная маса студэнтаў факультэта добрасумленна адносіцца да вучобы. Добры прыклад паказваюць студэнты-камуністы Пятровіч, Рымок, Бань. Кірыенка, а таксама камсамольцы Бахар, Ласько, Федароўская, Гурда, Рогач, Беланоўская, Злотнікава і інш. Аднак, ці ўсе такія? Не. Несур'ёзна адносяцца да вучобы, напрыклад, студэнтка першага курса Шаўчук, другога курса Абраменка і Каленік. Дрэнна паводзяць сябе на лекцыях першакурснікі Кастандзі і Секрэт. У чым жа прычына іх адставання і дрэнных паводзін? Камсамольскія курсавыя арганізацыі не вядуць паўсядзённай работы з адстаючымі. Галоўнае ў выхаваўчай рабоце—індывідуальны падыход і добрае веданне студэнтаў і тых, якія жывуць у інтэрнаце, і тых, якія з'яўляюцца мінчанамі.

Вялікую работу па выхаванню заклікана весці насценгазета. Змест «Геафака» палепшыўся, але, нажаль, публікуецца мала крытычных матэрыялаў аб вучобе, быце, паводзінах студэнтаў. Слаба папулярызуецца вопыт лепшых.

Не прыступала у гэтым годзе да работы лектарская група студэнтаў, якой кіруе студэнт пятага курса Яновіч.

Затым камуністы прыступілі да абмеркавання даклада.

Выступіўшыя ў спрэчках камуністы Рагозін, Маркаў, Шкляр, Трухан, Спірыдонаў спыніліся на розных баках палітыка-выхаваўчай і масава-фізкультурнай работы на факультэце.

— Для прадухілення выпадкаў няяўкі выпускнікоў на работу,— гаворыць сакратар партарганізацыі тав. Шкляр,—трэба выяўляць з самага пачатку схільнасці абітурыентаў да педагагічнай работы, раней, чым гэта было да цяперашняга часу, займацца размеркаваннем на работу. Студэнт-выпускнік павінен загадзя ведаць, у якую школу і з якой нагрузкай ён будзе накіраван па заканчэнні.

На неабходнасці ўзмацнення выхаваўчай ролі вучэбных заняткаў, асобных прадметаў спыніўся І. І. Трухан. Вывучэнне такіх прадметаў, як геаграфія замежных краін, дае магчымасць больш ярка ўявіць становішча моладзі ў капіталістычных краінах, а геалогія, напрыклад, выхоўвае ў студэнтаў дыялектычны светапогляд.

Далей выступаючы прапануе падняць ролю камсамольскіх курсавых бюро, часцей слухаць іх справаздачы на пасяджэннях партбюро, вучонага Савета.

Тав. Спірыдонаў выказаў прапанову аб змяненні сістэмы трэніровак. Трэба, каб больш увагі ўдзялялася масе ўдзельнікаў спартсекцый, а не толькі лепшым спартсменам. Выступіўшы ўслед за тав. Спірыдонавым Ф. Пятровіч гаворыць аб ролі камсамольскіх даручэнняў у выхаванні. Напрыклад, студэнтка трэцяга курса В. Мельнікава, будучы абрана старастай гуртка, стала па-сапраўднаму цікавіцца яго работай. Сакратар камсамольскага бюро трэцяга курса Ігнаценка рэагуе на кожны выпадак нядобрасумленных адносін студэнтаў да сваіх абавязкаў.

Тав. Дзяменцьеў і Карулін гаварылі аб значэнні лектарскай работы студэнтаў і аб своечасовым правядзенні палітінфармацый у групах.

Сход прыняў пастанову, накіраваную на паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы.

☆ ☆

Як паказалі прайшоўшыя сходы, партыйная работа на філалагічным, фізічным і геаграфічным факультэтах ідзе ў напрамку значнай актывізацыі і ўздыму.

**В. П. БАРАДЗІНА,**
**выкладчыца кафедры эканамічнай геаграфіі.**
**М. ШЫМАНСКІ,**
**наш. кар.**

### Да ведама членаў рэдкалегіі і актыва газеты „Беларускі універсітэт"

*Агульнарэдакцыйныя лятучкі пераносяцца з панядзелкаў на чацвяргі. Наступная лятучка адбудзецца 22 снежня гэтага года.*

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31;**
**Тэлефон: 2-07-19.**

**Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.**

АТ 11901. Зак. 2219.